ІНАВАЦЫІ Ў АДУКАЦЫІ: ПЕРАКУЛЕНЫ ЎРОК 5

УСЁ ПРА БЕЛАРУСКІ БАДМІНТОН 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. СУБОТА № 203 (28819)

ЦЫТАТА ДНЯ

Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын»:

«Самарэалізацыя жанчын у сферы малога бізнесу ў вёсцы толькі набірае абароты, менавіта ў гэтым бачацца вялікія рэсурсы для вырашэння пытання занятасці. Неабходна ўдзяляць павышаную ўвагу малому бізнесу на вёсцы, падтрымліваць яго развіццё, а мясцовым уладам ствараць неабходныя ўмовы для развіцця жаночага прадпрымальніцтва. Сярод пажаданняў, якія сёння часта можна пачуць, — каб больш увагі ўдзялялася развіццю сацыяльнай сферы ў сельскай мясцовасці. Гаворка ідзе пра месцы для вольнага часу. Павінны працаваць клубы, бібліятэкі, спартыўныя аб'екты, кафетэрыі — усё тое, чаго багата ёсць у горадзе. Хочацца, каб дзеці, калі вырастуць, вярталіся на малую радзіму, таму што тут ёсць не толькі дзе працаваць, але і дзе адпачываць».

КОРАТКА

- **Беларуская тэнісістка Арына Сабаленка прызнана навічком года ў Сусветнай тэніснай асацыяцыі (WTA).**



- Дзяржаўтаінспекцыя на выхадных правядзе масіраваную адпрацоўку аўтадарогі М10 мяжа РФ — Гомель — Кобрын.
- **Тэмпературныя рэкорды былі зафіксаваны 18 кастрычніка практычна на ўсіх метэастанцыях Беларусі, значэнні перавышалі рэкордныя на 2-3 градусы.**

ISSN 1990 - 763X

ДОБРА ТАМ, ДЗЕ МЫ ЁСЦЬ

Ад равеснікаў суверэннай Беларусі залежыць далейшае развіццё краіны

Такое меркаванне выказаў кіраўнік дзяржавы падчас выступлення на сустрэчы са студэнтамі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Перад гэтым для яго правялі экскурсію па ВНУ.

Адукацыя для Прэзідэнта

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: з прадстаўнікамі юнага пакалення Беларусі ён сустракаецца з вялікім задавальненнем. Уласныя студэнцкія гады Прэзідэнт назваў найцяжкім для сябе часам — паколькі па складзе з'яўляецца гуманітарыем, тэхнічныя рэчы даваліся няпроста.

Сёння кіраўнік дзяржавы актыўна займаецца перафарматаваннем вышэйшай адукацыі — спрабуе зрабіць яе практыка-арыентаванай. Ён настойвае, каб час знаходжання ў ВНУ быў скарочаны да мінімуму: калі можна за чатыры гады атрымаць адукацыю, то трэба за чатыры, а не за пяць ці шэсць.

На яго думку, лепш на першым курсе сысці з універсітэта, калі разумееш, што гэта не тваё, чым вучыцца пяць гадоў, мучыцца, марнаваць грошы (і свае, і дзяржаўныя) і потым сыходзіць. Беларускі лідар дадаў: трэба як мага раней акунуцца ў будучую прафесію, каб зразумець для сябе — хочаш ты гэтым займацца ці не.

Кіраўнік дзяржавы расказаў пра свой вопыт перанавучання. Стаўшы выкладчыкам, ён зразумеў, што яго цягне ў сельскую гаспадарку і прамысловасць. Разам з тым, гістарычная адукацыя яму вельмі дапамагла. Кіраўнік дзяржавы не сумняваецца: калі б не скончыў гістфак ці эканамічны факультэт, то не змог бы ўзначаліць краіну.

Аляксандр Лукашэнка крытычна ставіцца да сучаснага ўзроўню адукацыі. Ён заўважыў, што цяперашні міністр прыступае ўжо да трэцяй хвалі ўдасканалення гэтай сферы — яго папярэднікі таксама гэтым займаліся.

Хто пабудуе нашу будучыню

Беларускі лідар сказаў, што сённяшніх студэнтаў і іх аднагодкаў па ўсім свеце называюць пакаленнем Z, але для яго яны, перш за ўсё, дзеці маладой дзяржавы.

Маладыя людзі ўвойдуць у гісторыю як равеснікі суверэннай Беларусі. У гэтым заключаецца іх унікальнасць.

«Усе мы, хто стаяў ля вытокаў станаўлення нашай краіны, бачым у кожным з вас будучыню. І мы верым, што яна ў надзейных руках. І, гледзячы сёння на вашы поспехі і дасягненні, я яшчэ раз пра гэта падумаў», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што многія студэнты актыўна займаюцца навуковай дзейнасцю, імкнуцца да самаўдасканалення. Гэта з'яўляецца паказчыкам эфектыўнасці сістэмы адукацыі, а таксама майстэрства выкладчыкаў і навуковых кіраўнікоў.

Беларускі лідар пагадзіўся, што гродзенскія ВНУ з'яўляюцца інтэлектуальным цэнтрам не толькі вобласці, але па асобных кірунках — усёй краіны.

Фота БелТА.

Максімальна блізка да рэальнасці

«У гэтай сувязі трэба, каб умовы навучання былі максімальна набліжаны да рэальных умоў будучай дзейнасці», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт ведае аб сістэме «Універсітэт 3.0», якая актыўна выкарыстоўваецца ў Беларусі, і па якой працуе Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт. Прэзентацыя, прадстаўленая кіраўніку дзяржавы, яго ўразіла. Аднак, ці гатовыя студэнты самастойна ўдыхнуць жыццё ва ўласныя праекты? На думку Аляксандра Лукашэнкі, гатовыя, некаторыя з праектаў камерцыялізаваныя, сродкі прыходзяць.

Сістэма адукацыі павінна заахвочваць ініцыятыву, рыхтаваць спецыялістаў новай фармацыі з добра развітымі прадпрымальніцкімі навыкамі, паколькі гэта патрабаванне сучаснага свету, лічыць беларускі лідар. «Часта мы пакутуем менавіта праз тое, што не ўмеем выгадна прадставіць інтарэсы і магчымасці нашай краіны за мяжой», — заўважыў ён.

Прэзідэнт дадаў, што хацеў бы даведацца аб адносінах студэнтаў да перспектывы працы на дзяржаўнай службе. «Але пасля мяне, мне канкурэнты не патрэбныя», — пажартаваў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што будзе рады, калі праз нейкі час з'явяцца маладыя людзі, якім можна спакойна перадаць партфель. «Хтосьці прыйдзе іншы, пажадана, каб такія былі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Будзьце пільнымі

НАША ДАЧА — НАША КРЭПАСЦЬ

Мой сусед Уладзімір Міхайлавіч нядаўна прыехаў з дачы, дзе жыў усё лета і частку восені. Цяпер пахаладала, і ён, як многія, вярнуўся ў горад, пакінуўшы дачу «закансерваванай» да вясны. У размове са мной ён успомніў, што забыўся забраць з дачы бензапілу. Я заўважыў, што небяспечна пакідаць у неахоўным доме такія каштоўныя рэчы. На што Уладзімір Міхайлавіч даволі бестурботна адказаў, што побач жывуць суседзі, якія, калі што, дагледзяць і яго дом.

Вядома, што дачныя ўчасткі заўсёды прыцягваюць увагу злачыннага элемента — і менавіта ў сілу сваёй безабароннасці.

Якраз з гэтай нагоды я гутарыў з **намеснікам начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі УУС Мінскага райвыканкама падпалкоўнікам міліцыі Наталляй СМЯТАНКАЙ:**

— У нас на тэрыторыі раёна знаходзіцца 324 садовыя таварыствы. На вяснова-летні перыяд з горада на дачы прыязджае каля 60 тысяч чалавек. Папярэджанне праціпраўных дзеянняў, у прыватнасці замахаў на маёмасць грамадзян, — адна з нашых асноўных задач.

Ёсць Указ № 50 Прэзідэнта, які рэгулюе фінансава-гаспадарчую дзейнасць садовых таварыстваў (СТ). Ён прадугледжвае становішча, пры якім старшыні праўленняў СТ павінны прымаць меры па забеспячэнні захаванасці маёмасці членаў сваіх таварыстваў. Акрамя таго, мы, са свайго боку, прымаем меры па прафілактыцы правапарушэнняў у дачных пасёлках. Штогод СТ даследуюцца на прадмет іх тэхнічнай умацаванасці. Гэта праверка агародж па перыметры, надзейнасці ўязных варот, наяўнасці відэаназірання і іншага.

СТАР. 4